*Дзяніс Дук (Навапалацк)*

# ПОЛАЦК У СІСТЭМЕ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯТАПАГРАФІЧНАЙ СТРУКТУРЫ СТАРАЖЫТНАРУСКІХ ГАРАДОЎ IX – XIII СТСТ.*

**Уводзіны.** Полацк – адзін са старажытнейшых гарадоў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Пад 862 г. ў Лаўрэнцьеўскім летапісе знаходзім паведамленне аб раздачы наўгародскім князем**, скандынавам па паходжанні, Рурыкам гарадоў сваім васалам: "...раздая мужемъ своимъ грады овому Полотескъ овому Ростовъ другому Белоозеро и по тем городом суть находници Варязи а перьвии насельници в Новегороде Словене въ Полотьски Кривичи в Ростове Меря в Белеозере Весь в Муроме Мурома и теми всеми обладаше Рюрикъ..." [24, стб. 20]. У тэксце летапісу названа насельніцтва, якое заснавала Полацк – крывічы, у 862 г. у Полацку сеў княжыць варажскі князь, васал Рурыка. Аднак гісторыкі звяртаюць увагу на тое, што выраз "держати почаша родъ ихъ княженье... на Полоте, иже Полочане", прыведзены ў недатаванай частцы "Аповесці мінулых часоў", сведчыць аб наяўнасці ўласнай княжацкай дынастыі ў крывічоў-палачан, як і ў іншых славянскіх плямёнаў [26, с. 14].

У 862 г. Полацк уваходзіць у палітычны саюз славянскіх плямёнаў Паўночнай Русі на чале з Ноўгарадам (862-882 гг.), потым з Кіевам (882-912 гг.). Па вызначэнню Г.С. Лебедзева, Полацк у гэты час ўваходзіць у склад г. зв. "Дзяржавы Рурыка" [25, с. 529]. У 862–882 гг. у Полацку княжылі васалы князёў Рурыка і Алега. Напрыканцы X ст. у Полацку княжыць Рагвалод.

Такім чынам, Полацк у летапісах згадваецца ў ліку найбольш старажытных "градаў" Паўночнай Русі разам з Ладагай, Ноўгарадам, Белавозерам, Ізборскам, Растовам, Мурамам [24, стб. 20–21]. Арэал Паўночнай Русі дакладна пазначаны ў летапісе ў аповедзе пра раздачу Рурыкам гарадоў сваім васалам. Тым не менш археалагічных даных для характарыстыкі Полацка ў IX–X стст. да апошняга часу было відавочна недастаткова, на што ўжо звярталі ўвагу гісторыкі [3, с. 304–306; 33, с. 28–29]. Недастатковасць крынічнай базы прыводзіла асобных гісторыкаў нават да адмаўлення існавання Полацка раней за X ст. [3, с. 304–306; 21, с. 88–89; 33, с. 28–29].

Археалагічныя раскопкі ў 2007–2008 гг. далі новы матэрыял для асвятлення ролі і месца Полацка ў сістэме станаўлення старажытнарускіх гарадоў ў IX–XIII стст., таксама як і характарыстыкі пачатковай гісторыі горада [13; 14]***.

Мэта артыкула – зрабіць параўнаўчую характарыстыку сацыятапаграфічнай структуры Полацка ў сістэме станаўлення і развіцця старажытнарускіх гарадоў Паўночнай Русі IX–XIII стст. паводле даных археалагічных і пісьмовых крыніц. За аснову аналізу абраны тыя старажытнаруская "грады", якія на сённяшні дзень з'яўляюцца найбольш даследаванымі ў археалагічным плане і ўваходзілі ў склад г. зв. "Дзяржавы Рурыка" (Ладага, Ноўгарад, Ізборск, Пскоў, Віцебск).

Гісторыю Полацка немагчыма разглядаць без дэтэрмінацыі паняцця "Русь", пад якой для перыяду другой паловы VIII–X стст. разумеем назву этнапалітычнай супольнасці ва Усходняй Еўропе ў сярэдневякоўі [29, с. 145]. Для большасці плямёнаў Русі была характэрна славянская мова, носьбіты гэтай мовы дакладна пазначаны ў летапісе ў супрацьвагу іншамоўным плямёнам: "Словенескъ языкъ в Руси Поляне Деревляне Ноугородьци Полочане Дреговичи Северъ Бужане зане седоша по Бугу послеже же Велыняне а се суть инии языци иже дань дають Руси Чюдь Меря Весь Мурома Черемись Моръдва Пермь Печера Ямь Литва Зимигола Корсь Норова Либь..." [24, стб. 11].

---

* Работа выканана пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў і Расійскага гуманітарнага навуковага фонду, грант Г08 Р014 "Фарміраванне і развіццё сістэмы беларуска-расійскіх міжрэгіянальных кантактаў: сацыякультурны і эканамічны аспекты (Полацк, Віцебск, Ноўгарад, Пскоў: IX-XX вв.).

** Дагэтуль Рурык княжыў у Ладазе.

*** У 2008 г. былі праведзены раскопкі на старажытным вакольным горадзе, што пашырыла крынічную базу артэфактамі VI–X стст. Матэрыялы па выніках камеральнай апрацоўкі артэфактаў у супастаўленні з серыяй пяці радыевугляродных дат здадзены ў друк.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прагорад [41, с. 56], протагорад [36, с. 53], ці горад-эмбрыён [18, с. 36–37] – гэта выкарыстоўваемыя ў гістарыяграфіі назвы пачатковага гандлёва-рамеснага ці любога ўмацаванага пасялення, якое не афармілася яшчэ ў горад у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміна. Гэтыя тэрміны актыўна ўжываюцца гісторыкамі ў дачыненні да летапісных "градаў" Усходняй Еўропы IX – X стст.

У айчыннай гістарыяграфіі вылучаны характэрныя рысы для вызначэння раннесярэдневяковага горада: паведамленне пра горад у пісьмовых крыніцах як пра важны населены пункт, цэнтр акругі; наяўнасць дзяцінца (града) і пасада, плошча якога ў некалькі разоў пераважае плошчу дзяцінца; пражыванне ў ім значнай колькасці мясцовага гандлёва-рамеснага насельніцтва; існаванне гарадской абшчыны; наяўнасць складанага ўнутрыгарадскога плана з элементамі добраўпарадкавання; узвядзенне манументальных свецкіх ці культавых пабудоў [16, с. 27; 41, с. 55].

Сацыятапаграфічная структура гарадоў Паўночнай Русі (Ладага, Ноўгарад, Ізборск, Пскоў, Віцебск). Працэс станаўлення ўласна горада для кожнага пасялення вызначаўся індывідуальнымі характарыстыкамі. Сума накопленых гісторыкамі і археолагамі ведаў аб пачатковай гісторыі летапісных гарадоў Паўночнай Русі дазваляе вылучыць асноўныя рысы кожнага з іх.

Ладага згадваецца ў летапісе пад 862 г. як першая сталіца Русі: "И седе стареишии в Ладозе Рюрикъ" [17, стб. 14]. Пачатковая Ладага займала мыс на правым беразе ракі Волхаў пры ўпадзенні ў яе Ладажкі. На стрэлцы мыса ўзведзена невялікая (плошча каля 1 га) каменная крэпасць. Да яе прымыкалі ўмацаваныя ў позні сярэдневякоўі пасяленні Землянога горада. Ладага была заснавана ў сярэдзіне VIII ст. (паводле дэндрахраналагічнага вызначэння – у 753 г.). Старажытнае пасяленне мела плошчу 4–5 га і было неўмацаваным. Яно размяшчалася па абодвух берагах Ладажкі. Этнічны склад насельнітцва быў даволі стракатым. На рубяжы IX–X стст. на неўмацаванай раней стрэлцы мыса ўзводзяцца першыя крапасныя сцены. З X ст. славянскі этнічны кампанент у Ладазе пачынае дамінаваць, у XII ст. пасяленне займае плошчу 16 га [21, с. 88–89; 19, с. 38–39].

Пасля смерці братоў Трувора і Сінеўса ў 862 г. Рурык "пришел к Ильмерю и сруби город надъ Волховом, и прозваша и Новъгород, и седе ту княжа" [17, стб. 14]. З гэтага часу Ноўгарад з'яўляўся галоўным "градам" "Дзяржавы Рурыка". Гарадская тапаграфія Ноўгарада фарміравалася паступова на працягу значнага прамежку часу. Старажытнейшыя напластаванні Ноўгарада зафіксаваны толькі на Рурыкавым гарадзішчы, якое размешчана на адлегласці каля 2 км ад Ноўгарада. Гарадзішча было размешчана на перасячэнні гандлёвых шляхоў праз рэкі Мста, Шэлонь, Ловаць і Волхаў. Напрыканцы I тыс. плошча Гарадзішчанскага пасялення склала каля 6–7 га. У сярэдзіне IX ст. тут існаваў княжацкі двор, пры якім дзейнічала варажская дружына. Такім чынам, летапісны аповед аб запрашэнні Рурыка на княжанне мае адносіны да Гарадзішча [31, с. 272–273; 43, с. 10–11].

Найбольш раннія сведчанні засялення ўласна Ноўгарада паводле метаду дэндрахраналагічнага аналізу датуюцца на Нераўскім канцы 953 г., на Славенскім канцы – 973–974 гг., на Людзіным канцы каля 950 г. У гэты час склалася гарадская планіроўка вуліц і былі зафіксаваны першыя драўляныя маставыя, пагонная сядзібная планіроўка, машчэнне падвор'яў і г. д. Раней гэтага часу на месцы трох буйнейшых раёнаў горада археалагічна зафіксаваны ворыўныя палі і грунтавая дарога. На месцы ворыўных палёў будучага Ноўгарада паступова будаваліся вялікія сядзібы баяраў, планіроўка якіх практычна ў нязменным выглядзе існавала ў пазнейшыя часы да інкарпарацыі Ноўгарада ў склад Маскоўскай дзяржавы [20, с. 112]. У XII і XIII стст. колькасць канцоў павялічваецца ў выніку пашырэння плошчы горада і засваення пад забудову новых значных тэрыторый (да 1169 г. фарміруецца Плотніцкі канец).

Такім чынам, Ноўгарад становіцца горадам не раней сярэдзіны X ст. У гэты час Рурыкава гарадзішча і новыя пасяленні развіваліся асобна [43, с. 10–11]. У пачатку XI ст. Яраслаў Уладзіміравіч перанёс сваю рэзідэнцыю ўніз па цячэнню Волхава да торга, аднаго з цэнтраў новых пасяленняў, што адлюстравана ў значным зніжэнні інтэнсіўнасці жыцця на Гарадзішчы. Двор князя быў уладкаваны на ўскраіне Славенскага пагорка, яшчэ вольнай у XI ст. ад шчыльнай забудовы. Княжацкая рэзідэнцыя была другаснай у дачыненні да існаваўшага там пасялення. Разам з сядзібай Яраслава размяшчаўся двор яго дружыннікаў. Перанос рэзідэнцыі князя з'яўляўся буйным палітычным актам дзяржаўнага значэння. Апошнім крокам у гэтым працэсе стала будаўніцтва Уладзімірам Яраславічам у 1044 г. Новага горада (крэпасці) на месцы ўладычнага двара, паколькі гарадок у вытоках Волхава не мог выконваць функцыі абароны вялікага пасялення. Адначасова ў цэнтры дзяцінца быў закладзены каменны Сафійскі сабор [31, с. 274].

У апошняй трэці XI ст. працягваецца ўзмацненне наўгародскага баярства, якое адлюстравана ў з'яўленні інстытута пасадніцтва новага тыпу і тым самым ва ўмацаванні гарадскога самакіравання. У выніку князі былі вымушаны зноў пераехаць на Гарадзішча, але захавалі за сабой правы на Яраславава Дворышча як на гарадскую сядзібу. У 1103 г. на Гарадзішчы ўзводзіцца Дабравешчанскі сабор, які проціпастаўляўся агульнагарадскому Сафійскаму храму [31, с. 274].

Пскоў і Ізборск размешчаны на адлегласці менш за 30 км адзін ад аднаго. Паводле С.В. Бялецкага, у VIII – сярэдзіне IX стст. на Труваравым гарадзішчы сучаснага Ізборска размяшчалася гандлёва-раменае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пасяленне імігрантаў-славян, носьбітаў культуры доўгіх курганоў. У сярэдзіне IX ст. жыццё на гарадзішчы спыняецца не без удзелу скандынаўскага насельніцтва, верагодна, прафесійных воінаў. Аднаўленне жыцця адбываецца ў XI ст., што звязана ўжо з летапісным Ізборскам. Такім чынам, паводле С.В. Бялецкага, найстаражытнейшае пасяленне на Труваравым гарадзішчы не з'яўляецца прадцечай летапіснага Ізборска [2, с. 32–33; 3, с. 89–90].

Паводле В.В. Сядова, Ізборск у VIII–IX стст. з'яўляўся не радавым пасяленнем. Падчас раскопак былі выяўлены сляды вечавай плошчы і капішча, захаваліся сведчанні гандлёва-рамеснай дзейнасці старажытнага насельніцтва. Пачатковае пасяленне выконвала адміністрацыйна-племянныя і культавыя функцыі як племянны цэнтр адной з груповак крывічоў. Скандынаўскі ўплыў на матэрыяльную культуру насельніцтва старажытнага Ізборска прасочваецца ў невялікай ступені, у адрозненне ад Ладагі, Рурыкава і Пскоўскага гарадзішчаў. У X ст. гарадзішча было значна перабудавана, што адлюстроўвае працэсы станаўлення сярэдневяковага горада. Выспавая частка гарадзішча ўмацоўваецца па перыметру дубовай сцяной і пераўтвараецца ў дзяцінец, а ўмацаваная каменнай сцяной паўднёвая частка гарадзішча становіцца вакольным горадам. Дзяцінцам Ізборска Труварава гарадзішча з'яўлялася да 1329 г. калі пскоўскі пасаднік Шэлога з пскавічамі і ізбаранамі пабудаваў крэпасць на Жэраўей гары за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад гарадзішча. Гэтая крэпасць стала дзяцінцам Ізборска да Новага часу. Такім чынам, паводле В.В. Сядова, Ізборск VIII–IX стст. можна лічыць пратагорадам, які ў X ст. трансфармаваўся ў раннесярэдневяковы горад. За межамі ўмацаванняў Ізборска з X ст. разрастаюцца пасадскія пасяленні [34, с. 140–141; 35, с. 117].

Старажытнае пскоўскае гарадзішча мела плошчу каля 2 га і пляцоўку авальнай формы. На ім існавалі пасяленні культуры каменных могільнікаў сярэдзіны I тыс., культуры доўгіх курганоў апошняй чвэрці I тыс., у VIII–IX стст. на гарадзішчы існавала пасяленне культуры тыпу Камно-Рыуга [2, с. 55–70]. У паўднёвай частцы гарадзішча размяшчаўся пасад, язычніцкае капішча і курганны некропаль. Гэтыя тапаграфічныя адзінкі датуюцца часам не раней за X ст. [23, с. 190–191]. Этнічная прыналежнасць насельніцтва пачатковага Пскова вызначаецца як поліэтнічнае з перавагай прыбалтыйска-фінскага элемента пры ўдзеле латталаў, славян і скандынаваў. Раннегарадское пасяленне на месцы Пскова было знішчана ў першай палове XI ст., раней за 1044 г., пасля чаго пачынаецца ўласна "гарадскі" этап развіцця Пскова.

Паводле С.В. Бялецкага, група славян–імігрантаў у сярэдзіне IX ст. перасялілася на спаленае пасяленне аўтахтонаў пры вусці ракі Псковы. Гэтае пасяленне паступова пераўтварылася ў ядро будучага Пскова, у X ст. тут фарміруецца старажытнарускі горад.

У XIV ст. фарміруецца станаўленне Пскова як цэнтра самастойнай феадальнай рэспублікі. Пскоў складаўся з пскоўскага дзяцінца, дзе размяшчаліся органы гарадскога кіравання, тут захоўвалася зерне і іншая сельскагаспадарчая прадукцыя, адзенне. Каля дзяцінца праходзіла другая лінія ўмацаванняў – *Даўмонтава сцяна.* Побач з умацаваннямі размяшчалася люднае Таргавішча – плошча з гандлёвымі памяшканнямі, замошчаная дрэвам. Сюды сыходзіліся радыусы галоўных вуліц з розных бакоў – з Завелічча, Запскоўя, Паланішча. Астатняя частка горада да сцяны 1309 г. (знешняя лінія гарадскіх умацаванняў) была занята пераважна жылой забудовай. Агульная плошча трох частак горада – дзяцінца, Даўмонтавай сцяны і прасторай паміж Даўмонтавай сцяной і сцяной 1309 г. складала каля 20 га. Пасад Пскова хутка пашыраўся у міжрэччы Псковы і Вялікай і быў умацаваны каменнай сцяной ў 1374/1375 гг. Плошча горада павялічылася да 39 га. На ўскраінах пасада размяшчаліся агароды і нівы. Плошча пасада значна пашырылася да сярэдзіны XV ст., у гэты час горад займаў плошчу 211,27 га [22, с. 240–244].

Віцебск паўстаў як пагост, заснаваны княжной Вольгай на адрэзку шляху "з варагаў у грэкі" (з 947 г.). Ён з'яўляўся цэнтрам племяннной акругі ў дадзяржаўны перыяд і валаснай (з 1021 г.).у складзе Полацкай зямлі.

Віцебск узнік не пазней X ст. пры ўпадзенні Віцьбы ў Заходнюю Дзвіну. У X–XI стст. ён структурна складаўся з Замкавай гары (умацаванае гарадзішча) і некалькіх пасяленняў каля яе падножжа агульнай плошчай прыблізна 6 га. Фарміраванне гандлёва-рамеснага пасада адбывалася на аснове зліцця пасяленняў вакол Замкавай гары на працягу XI–XII стст. У XII ст. у горадзе існаваў торг. У 40-я гады XII ст. з захаду ад Замкавай гары (дзяцінца) на аснове пасадскога пасялення паўночнай часткі Дзвінскага ўзвышша утвараецца ўмацаваны вакольны горад. Паўднёва-заходняя і ўсходняя часткі пасадаў да сярэдзіны XIV ст. не былі ўмацаванымі. Напрыканцы XIII ст. агульная плошча дзяцінца, вакольнага горада і пасадаў Віцебска складалі да 10 га, на іх аснове ў XIV ст. фарміруюцца Верхні і Ніжні замкі. [ 4, с. 26–27; 5, с. 151; 28, с. 26, 48].

На працягу X–XII стст. утвараюцца пасяленні на правым беразе Віцьбы плошчай 2,5 га, якія, верагодна, таксама з'яўляліся часткай гарадскога пасада [27, с. 147–148].

Асаблівую цікавасць прадстаўляе ніжні стратыграфічны пласт Віцебска (стратыграфічны пласт 1 Дзвінскага ўзвышша і пласт 2 Ніжняга замка), які ўтрымлівае матэрыялы трэцяй чвэрці I тыс. н. ч. і апошняй чвэрці I тыс. н. ч. (адпаведна керамічныя гаршкі і рэчавыя комплексы банцараўскай культуры і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў). Гэта стратыграфічна аднародны пласт, які не мае сцерыльных прапластак і слядоў храналагічнай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лакуны. Вышэй гэтага пласта залягае стратыграфічны пласт 2, які ўтрымлівае ляпную кераміку IX–X стст. разам з раннеганчарнай і падпраўленай на ганчарным крузе [26, с. 11–12]. Аналагічная стратыграфічная сітуацыя зафіксавана на пляцоўцы гарадзішча старажытнага Лукомля. Тут раскапаны чорны гумусаваны пласт з ляпной керамікай і рэчамі другой паловы I тыс. н. ч., а ва ўсходняй частцы гарадзішча – рэшткі абарончых збудаванняў апошняй чвэрці I тыс., якія загінулі ў моцным пажары [15, с. 110]. Пад гэтым пластом размяшчаўся пласт з керамікай днепра-дзвінскай культуры, які быў знішчаны ў пазнейшы час і захаваўся толькі ў мацерыковых ямах. Паводле Г.В. Штыхава, "перерыва в заселении городища и селища не прослеживается на протяжении раннего и позднего средневековья" [42, с. 3]. Такая ж карціна зафіксавана на полацкім гарадзішчы і вакольным горадзе, аб чым гаворка пойдзе ніжэй. Тут жа важна падкрэсліць той факт, што гэтая група помнікаў існавала ў адзін час у рэгіёне Беларускага Падзвіння і мае выразнае стратыграфічнае падабенства раннесярэдневяковых напластаванняў.

**Сацыятапаграфічная структура Полацка.** У IX–X стст. Полацк з'яўляўся галоўным ("старшым") горадам сваёй "вобласці", аснову якой Г.В. Штыхаў небезпадстаўна атаясамляе з насельніцтвам заходняга арэала культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў [42, с. 2–3]. Полацк з'яўляўся цэнтрам племянной групоўкі крывічоў-палачан і атрымаў назву ад ракі Палата [24, стб. 10]. Найбольш верагодна, што тапонім "Полацк" выкарыстоўвала пачатковае балцкае насельніцтва гарадзішча, напрыканцы VIII ст. яго перанялі славяне.

Старажытны град быў заснаваны на пагорку мысавага тыпу плошчай каля 1 га, на якім прыкладна з VII ст. да н. ч. пражывалі балцкія плямёны днепра-дзвінскай і банцараўскай культур [14].

Тэрыторыя горада ў IX ст. не абмяжоўвалася гарадзішчам, побач з ім узнікалі паселішчы, таму сумарная плошча пасялення была не меней як 8 га. Тапаграфічная структура Полацка развівалася монацэнтрычна. Ад гарадзішча ў радыяльным напрамку Полацк "абрастаў" пасяленнямі. Найбольш значнае па плошчы пасяленне (г. зв. селішча ці перадграддзе) размясцілася на поўдзень ад гарадзішча – на месцы Ніжняга замка (плошча каля 6 га). Гэта і быў вакольны горад дафеадальнага Полацка. Меншае па плошчы "перадграддзе" выяўлена на правым беразе Палаты, плошчай 0,25 га. Па ўсёй верагоднасці, аналагічныя невялічкія па плошчы "перадграддзі" маглі існаваць і на паўночным захадзе ад гарадзішча на правым беразе Палаты. Аднак іх археалагічнае даследаванне ўскладняецца шчыльнай сучаснай забудовай [38, с. 42].

Даныя радыевугляроднага датавання разам з комплексам рэчаў сведчаць аб пражыванні на гарадзішчы насельніцтва культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў у 780 г., нашмат раней за дату першай летапіснай згадкі Полацка (862 г.) [14]. Працяг раскопак старажытнага Полацка ў 2008 г. на тэрыторыі старажытнага вакольнага горада пацвердзіў факт наяўнасці на ім аднароднага стратыграфічнага пласта другой паловы I тыс. н. ч. У гэтым пласце былі знойдзены фрагменты ляпной керамікі банцараўскай культуры і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў разам з рэчамі апошняй чвэрці I тыс. н. ч. Атрыманая серыя пяці радыёвугляродных дат з гэтага пласта пацвярджае пазначанае датаванне.

Такім чынам, у другой палове VIII ст., але не пазней 780 г., на гарадзішчы пры вусці Палаты крывічамі быў заснаваны моцны племянны і рэгіянальны цэнтр, ядро будучага княства.

З пачатку XI ст. полацкае гарадзішча выкарыстоўвалася як рэзідэнцыя полацкіх князёў – Ізяславічаў, "рагвалодавых унукаў". Разам з князем на гарадзішчы пражывала мясцовае славянскае рамеснае насельніцтва, якое абслугоўвала патрэбы княжацкага двара. Радыевугляродная дата – 1310 г. з комплексам знаходак пачатку XIV ст. вызначае час спынення існавання княжацкай рэзідэнцыі на гарадзішчы. Гэта, магчыма, абумоўлена ўваходжаннем Полацка ў склад ВКЛ і зменамі палітычнага статуса горада [14, с. 27].

Папулярная ў гістарыяграфіі думка пра размяшэнне княжацкай рэзідэнцыі і княжацкага двара з XII ст. за межамі горада [8] вынікае з фрагменту летапісу пра падзеі 1159 г. Пад гэтым годам у летапісе пазначаюцца тапаграфічныя аб'екты, якія проціпастаўляюцца "гораду". Гаворка ідзе пра мястэчка "Бельцици". У той час там ужо існаваў буйнейшы манастыр з чатырма мураванымі цэрквамі. Паводле летапісу, у 1159 г. дзесьці ў Бельчыцы, магчыма, непасрэдна на тэрыторыі манастыра, размяшчаліся князь і яго дружына. Аднак факт знаходжання князя Расціслава ў Бельчыцы ў часы найвышэйшага супрацьстаяння князя і "Полцанъ"* не з'яўляецца доказам размяшчэння ў манастыры княжацкай рэзідэнцыі. Наадварот, агульнапрызнана, што у часы супрацьстаяння з народам князь імкнуўся знаходзіцца па-за межамі горада, а не на тэрыторыі дзяцінца [21, с. 65–66]. У летапісе пра падзеі 1159 г. дакладна пазначана, што папярэджаны сваім "дзецкім" князь Расціслаў на паўдарозе вярнуўся ў Бельчыцу, адкуль разам з дружынай накіраваўся ў Менск да свайго брата Валадара. Манастыр размешчаны па дарозе на Менск і факт часовага** знаходжання дружыны толькі падкрэслівае значнасць фартыфікацыйнай функцыі Бельчыцкага манастыра, размешчанага ў зручным для князя месцы на шляху ў Менск, але зусім не з'яўляецца доказам размяшчэння ў Бельчыцы княжацкай рэзідэнцыі.

---

* Паводле той жа крыніцы князю процістаяла полацкае веча.

** Часовасць пражывання князя ў Бельчыцы вынікае з тэксту крыніцы "бо князь в то веремя на Бельцици".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На правым беразе Палаты ўздоўж Дзвіны ў XI ст. фарміруецца Запалоцкі пасад [11, с. 52–53]. У XI ст. пры вусці Палаты паўстае Верхні замак, які выконваў адміністрацыйна-цырыманіяльныя функцыі. Вялікі пасад фарміруецца на аснове вакольнага горада, межы якога ён пераўзышоў у другой палове XII ст. У XII ст. паўстаюць дзве буйнейшыя культавыя ўстановы – Спаса-Еўфрасіннеўскі і Бельчыцкі Барысаглебскі манастыры, размешчаныя за межамі горада.

Якім чынам адзначаныя працэсы станаўлення тапаграфічнай структуры Полацка ў IX–XIII стст. карэлююцца з аналагічнымі працэсамі іншых старажытных гарадоў Паўночнай Русі?

Відавочна, што тапаграфічнае развіццё Полацка на пачатковым этапе мае адметныя рысы наяўнасці веерна-радыяльнай структуры з цэнтрам на гарадзішчы*. Цэнтрам горада ў IX ст. з'яўлялася гарадзішча, а ў бок Дзвіны ўздоўж левага берага Палаты працягнуўся вакольны горад – ядро будучага Вялікага пасада. Падобнай мадэлі развіцця тапаграфіі ў найстаражытнейшых стольных "градах" Паўночнай Русі (Ладага, Ноўгарад) у IX – X стст. не назіраецца. Тым не менш схема развіцця "дзяцінец–вакольны горад (ядро будучага пасада)" у IX–X стст. характэрна для Ізборска**, Пскова і Віцебска, з X ст. – для Ладагі і з XI ст. – Ноўгарада.

У XI ст., падчас станаўлення ўласна горада ў сацыяльна-эканамічным разуменні і феадалізацыі грамадства, у Полацку адбываюцца змены тапаграфічнай структуры, якія маюць найбольшыя падабенствы з Ноўгарадам. Так, перанос рэзідэнцыі наўгародскіх князей у пачатку XI ст. практычна сінхронны па часе аналагічнаму працэсу ў Полацку, які Г.В. Штыхаў і С.В. Тарасаў датуюць адпаведна пачаткам ці сярэдзінай XI ст. [37, с. 37; 40, с. 23].

Археалагічныя даследаванні 2007 г. на полацкім гарадзішчы пацвярджаюць, што княжацкая рэзідэнцыя існавала на ім і ў XI – пачатку XIV стст., пры гэтым менавіта на гэты час прыпадае найбольшая інтэнсіўнасць жыцця на помніку. Што тычыцца Верхняга замка Полацка, то сляды дзейнасці княжацкай адміністрацыі фіксуюцца па наяўнасці непадалёк ад Сафійскага сабора княжацкага храма Архангела Міхаіла і княжацкага церама. Першы пабудаваны ў другой палове XII ст. Датаванне апошняга тым жа часам выклікае сумненні, паколькі печ драўлянай пабудовы каля церама, якая ўтварала агульны з ім архітэктурны ансамбль, датуецца 1304 г. [32]. Такім чынам, можна ўпэўнена сцвярджаць, што двор князя з сярэдзіны XI ст. размяшчаўся на гарадзішчы, а дзейнасць княжацкай адміністрацыі на Верхнім замку да пачатку XIV ст. можна вызначыць толькі гіпатэтычна. Нават пры адкрыцці наяўных доказаў дзейнасці князя на Верхнім замку раней за XIV ст. факт выкарыстання гарадзішча як жылой рэзідэнцыі полацкіх князей цяжка аспрэчыць. У XII ст. на гарадзішчы будуецца царква, прысутнасць якой археалагічна зафіксавана [9, с. 39]. Падобная сітуацыя назіраецца ў Ноўгарадзе, дзе існавала процістаўленне Дабравешчанскага сабора на Гарадзішчы Сафійскаму сабору на Яраслававым Дворышчы.

Сітуацыя з размяшчэннем княжацкага двара змянілася ў пачатку XIV ст. (уваходжанне Полацка ў склад ВКЛ) [6, с. 10]. Пасля "цьмянага" для Полацка перыяду тэакратычнай улады, дзесьці пасля 1326 г., калі быў пасаджаны на княжанне брат Гедыміна – Воінь, жыццё на гарадзішчы спыняецца і праз некалькі стагоддзяў яно ператвараецца ў гарадскія могілкі [13].

На полацкім гарадзішчы разам з князем і дружынай пражывала рамеснае насельніцтва [9]. Для Верхняга замка гэтая сітуацыя не характэрна. Тут у XI–XIII стст. размяшчаліся манастыры, цэрквы, княжацкі церам і епіскапскі двор. Выяўленая сядзібная забудова рамеснікаў (ювеліраў, касцярэзаў, кавалёў і інш.) у XI–XIII стст. размяшчалася каля Верхняга замка, фактычна на пасадскай тэрыторыі [37, с. 63; 40, с. 37–55].

Прысутнасць варагаў (скандынаваў) на полацкім гарадзішчы і вакольным горадзе па рэчаваму матэрыялу практычна не прасочваецца. Гэта з'яўляецца адметнай рысай, якая адрознівае Полацк ад Рурыкавага гарадзішча ў Ноўгарадзе і г. зв. "Землянога гарадзішча" ў Старай Ладазе, дзе знойдзены багаты асартымент скандынаўскай зброі і ўпрыгажэнняў [7, с. 135; 30, с. 26–27; 43, с. 10–11]. На Рурыкавым гарадзішчы пражывала поліэтнічнае насельніцтва, а статус пасялення вызначаецца як гандлёва-рамесны і ваенна-адміністрацыйны цэнтр [30, с. 26–27]. Знойдзены археолагамі на Полацкім гарадзішчы, вакольным горадзе і паселішчы-перадграддзі комплекс рэчаў IX–X стст. з'яўляецца тыповым для гістарычнай акругі Полацка і славянскага насельніцтва ўсходнееўрапейскага рэгіёна ў цэлым [33, с. 28]. Усё гэта пацвярджае, што пачатковая крэпасць на гарадзішчы была заснавана славянамі-крывічамі і функцыянавала без шырокага ўдзелу скандынаваў [13, с. 25–31]. У адрозненне ад Ноўгарада пасадская структура Полацка фарміравалася сінхронна часу існавання гарадзішча і мела прамое дачыненне да летапіснага "града" IX ст.

Асобныя сядзібы полацкіх рамеснікаў на пасадах па багаццю не саступалі баярскім у Ноўгарадзе [39, с. 270]. Зварот да наўгародскіх матэрыялаў не выпадковы, паколькі баярскіх сядзіб XI–XIV

---

* Мы падзяляем думку аб магчымасці існавання радыяльнай структуры пачатковага пасялення [33, с. 30], аднак надзейнай крынічнай базы для такога сцвярджэння на сённяшні дзень няма.

** Погляд на пачатковую гісторыю Ізборска больш аргументаваны ў канцэпцыі С.В. Бялецкага, якая і ўзята намі за аснову гістарычнага параўнання.

*** Погляды гісторыкаў на этнічную прыналежнасць абедзвюх культур разгледжана намі ў асобным артыкуле [10].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стст. у Полацку археалагічна не выяўлена. Аднак іх месцазнаходжанне ў гэты час можна вызначыць рэтраспектыўна. Так, сляды сядзіб баяр-шляхты археалагічна зафіксаваны на тэрыторыі Верхняга замка, Вялікага і Запалоцкага пасадаў у канцы XVI – XVII стст. [12, с. 68]. Гэтыя сядзібы размешчаны цераспалосна з сядзібамі рамеснікаў і вылучаюцца па наяўнасці печаў з "гербавай" кафляй і адмысловаму інвентару. Варта спадзявацца, што працяг вывучэння пасадаў вялікай плошчай дазволіць выявіць баярскія сядзібы XI–XV стст.

**Заключэнне.** Такім чынам, Полацк з'яўляецца адным з самых старажытных гарадоў на тэрыторыі Паўночнай Русі. Археалагічны матэрыял цалкам пацвярджае даныя летапісных крыніц аб існаванні Полацка ў IX ст. разам з такімі летапіснымі "градамі" як Ладага, Ноўгарад, Ізборск, Пскоў. Схема развіцця "дзяцінец–вакольны горад (ядро будучага пасада)" у IX–X стст. характэрна для Ізборска, Пскова і Віцебска, з X ст. – для Ладагі і з XI ст. – Ноўгарада.

Сацыятапаграфічная структура Полацка ў IX–XIII стст. прайшла складаны шлях развіцця, які мае свае адметнасці ад аналагічных працэсаў ў гарадах Паўночнай Русі. Варажскі этнічны элемент у Полацку прасочваецца ў значна меншай ступені ў параўнанні з Ладагай і Ноўгарадам. Стратыграфія культурнага пласта і матэрыяльная культура другой паловы I тыс. мае найбольшыя падабенствы менавіта з гарадамі Беларускага Падзвіння (Віцебскам і Лукомлем). Полацк узнік на аснове аўтахтоннага пасялення балтаў днепрадзвінскай, банцараўскай культур. Культурны пласт трэцяй і апошняй чвэрці I тыс. н. ч. найлепш захаваўся на тэрыторыі вакольнага горада. Керамічны комплекс банцараўскай і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў з гэтага пласта сведчыць аб пэўным этапе сумеснага пражывання двух этнасаў (усходніх балтаў і славян-крывічоў[3]) пачатковага Полацка. Што тычыцца гарадзішча, то керамічныя комплексы адзначанага часу тут прысутнічаюць ў моцна перамешаных культурных напластаваннях разам з раннеганчарнай керамікай, што сведчыць пра больш складаны характар гісторыі помніка.

Станаўленне сярэдневяковага Полацка прыпадае на сярэдзіну XI ст., тое ж можна адзначыць і ў дачыненні да іншых гарадоў Паўночнай Русі (Ноўгарад, Ізборск, Пскоў). Віцебск, які у XI ст. вылучаецца як валасны цэнтр Полацка, а рысы горада з развітымі гандлёва-рамеснымі функцыямі набывае ў XII ст., таксама першапачаткова быў племянным цэнтрам крывічоў, які княжацкая ўлада Кіева пераўтварыла у пагост ў другой палове X ст.

ЛІТАРАТУРА

1. Белецкий, С.В. Новые публикации материалов раскопок средневековых городов Белоруссии / С.В. Белецкий, Ю.А. Лесман // Советская археология. – 1979. – № 1. – С. 303–313.

2. Белецкий, В.Д. Городское ядро средневекового Пскова. Ч. 1: Белецкий С.В. / В.Д. Белецкий, С.В. Белецкий. Начало Пскова. – СПб., 1996. – 92 с.

3. Белецкий, С.В. О нижнем слое Труворова городища (керамика и хронология) / С.В. Белецкий, Ю.М. Лесман // Изборск и его округа (Материалы II международной научно-практической конференции). – Изборск, 2006. – С. 71–100.

4. Бубенько, Т.С. Социотопографическая структура посада средневекового Витебска (X – первая половина XIV вв.) / Т.С. Бубенько // Труды VI Международного конгресса славянской археологии. Т. 2. Славянский средневековый город. – М.: НПБО "Фонд археологии", 1997. – С. 23–30.

5. Бубенько, Т.С. Средневековый Витебск. Посад–Нижний замок (X – первая половина XIV в.): Монография / Т.С. Бубенько. – Витебск: Издательство УО «ВГУ им П.М. Машерова», 2004. – 276 с.: ил.

6. Воронін, В.А. Падзеі 1307 года ў Полацку: спроба крытычнага разбору / В.А. Воронін // Тэзісы V міжнароднай канферэнцыі "Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі". / Уклад. Г.М. Раманенкава – Полацк: НПГКМЗ, 2007. – С. 10–11.

7. Волковицкий, А.И. Материальная культура древней Ладоги / А.И. Волковицкий, Б.С. Короткевич, С.Л. Кузьмин // Старая Ладога. Древняя столица Руси. Каталог выставки – СПб: Изд-во Государственного Эрмитажа, 2003. – С. 133–142.

8. Дук, Д. Величие и безвестие: храмы Бельчицкого Борисоглебского монастыря в Полоцке Д. Дук // Родина. – 2008. – № 8. – С. 43–45.

9. Дук, Д. Древо жизни Полоцкого городища Д. Дук // Родина. – 2007. - № 10. – С. 37–39.

10. Дук, Д. Роль и место этнических миграций в формировании славянской (кривичской) культуры на Подвинье / Д. Дук // Rytø Europos Kultūra migracijos kontekste. Tarpdalykiniai tyrimai. (Культура Восточной Европы в контексте миграции. Междисциплинарные исследования). – Lietuvos istorijos institutes: "Versus aureus", 2007. – С. 473–490.

11. Дук, Д.У. Да вынікаў археалагічных раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 г. / Д.У. Дук // Археалагічны зборнік. Вып. 1 / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі; уклад. М.А. Плавінскі В.М. Сідаровіч. – Мінск: Юніпак, 2006. – С. 52–57.

12. Дук, Д.У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ 2007. – 268 с.: іл.

13. Дук, Д.У. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. / Д.У. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25–31.

14. Дук, Д.У. Старажытныя славяне полацкага гарадзішча (780–1310 гг.) Д.У. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 7. – С. 21–27.

15. Еремеев, И. Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой / И

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Еремеев, Г. Штыхов // Acta archaeologica Albaruteniса. Vol. I. (Вып. 1) / Уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2007. – С. 110–134.

16. Загорульский, Э.М. Древняя история Белоруссии: автореф. Дисс. ... доктора ист. наук / Э.М. Загорульский. – М., 1983. – 18 с.

17. Ипатьевская летопись. (Полное собрание русских летописей. Том второй.)– М.: «Языки русской культуры», 1998. – 648 с.

18. Карлов, В.В. О факторах экономического и политического развития русского города в эпоху средневековья В.В. Карлов // Русский город (историко-методологический сборник). – М.: Издательство Московского университета, 1976. – С. 32–69.

19. Кирпичников, А. Ладожская жемчужина в Балтийском мире / А. Кирпичников // Родина. – 2008. – № 9. – С. 37–40.

20. Колчин, Б.А. Археологии Новгорода 50 лет / Б.А. Колчин, В.Л. Янин // Новгородский сборник (50 лет раскопок Новгорода). – М.: Наука, 1982. – С. 3–137.

21. Куза, А.В. Древнерусские поселения / А.В. Куза // Древняя Русь. Город, замок, село. / Археология СССР. – М.: «Наука», 1985. – С. 39–135.

22. Лабутина, И.К. Историческая топография Пскова в XIV–XV вв. / И.К. Лабутина. – М.: Наука, 1985. – 248 с.

23. Лабутина, И.К. Раскопки в древней части посада средневекового Пскова (1967–1991 гг.) / И.К. Лабутина // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 2. Славянский средневековый город. – М.: НПБО "Фонд археологии", 1997. – С. 188–196.

24. Лаврентьевская летопись. (Полное собрание русских летописей. Том первый.) – М.: «Языки русской культуры», 1997. – 496 с.

25. Лебедев, Г.С. Эпоха викингов в Северной Европе и на Руси / Г.С. Лебедев. – СПб: Евразия, 2005. – 640 с.

26. Левко, О.Н. Полоцк – древнейший центр белорусской государственности и актуальные проблемы отечественной истории / О.Н. Левко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. 2008. № 1. – С. 7–16.

27. Левко, О.Н. Социально-топографическая и планировочная структура белорусского феодального города (по материалам Витебска) / О.Н. Левко // Труды V Международного конгресса славянской археологии. Т. 1. Вып. 2а. Секция II. Происхождение и эволюция раннесредневекового города. М., 1987. – С. 147–150.

28. Левко, О.Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие / О.Н. Левко. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 280 с.

29. Насевіч, В. Русь / В. Насевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузыны–Усая. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 145–146.

30. Носов, Е. Город новый–город старый (Рюриково городище–Новгород–София) / Е. Носов // Родина. – 2007. – № 6. – С. 26–27.

31. Носов, Е.Н. У истоков Новгорода / Е.Н. Носов // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 2. Славянский средневековый город. – М.: НПБО "Фонд археологии", 1997. – С. 272–285.

32. Паничева, Л.Г. Белорусские изразцы XIV – XVII вв. как исторический источник: автореф. дис... канд. ист. наук: 07.00.06 / Л.Г. Паничева; Ин-т археологии АН СССР. – Л., 1980. – 16 с.

33. Плавінскі, М. Полацк да Рагвалода (пытанні тапаграфіі і храналогіі культурнага слоя) / М. Плавінскі // Acta archaeological Albaruteniса. Vol. II (Вып. 2) / Уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. – С. 25–44.

34. Седов, В.В. Изборск в VIII–X веках / В.В. Седов // Дружинні старожитності Центрально-Східно Європии VIII–XI ст. – Чернігів: Сіверянська думка, 2003. – С. С. 138–144.

35. Седов, В.В. Изборск в раннем Средневековье / В.В. Седов [отв. ред Н.А. Макаров] ; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2007. – 413 с. : ил.

36. Седов, В.В. Начало городов на Руси / В.В. Седов // Древнерусское государство и славяне. – Мн.: Наука и техника, 1983. С. 53–54.

37. Тарасаў, С.В. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 183 с.: іл.

38. Тарасаў, С.В. Селішча / С.В. Тарасаў // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка / Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – С. 42–43.

39. Тарасаў, С.В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIII стст. / С.В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі // Матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Полацк: НПГКМЗ, 2003. – С. 267–272.

40. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Мн., «Наука и техника», 1975. – 136 с.: ил.

41. Штыхов, Г.В. Киев и древние города Белоруссии / Г.В. Штыхов // Древнерусское государство и славяне. – Мн., 1983. С. 56–57.

42. Штыхов, Г.В. Средневековые города Беларуси и их предшественники (к проблеме восточнославянского протогорода) / Г.В. Штыхов // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. 2008. № 1. – С. 2–6.

43. Янин, В.Л. Основные итоги археологического изучения Новгорода / В.Л. Янин // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 2. Славянский средневековый город. – М.: НПБО "Фонд археологии", 1997. – С. 6–12.

Электронный архив библиотеки ПГУ имени А.А. Кулешова

*Денис Дук*

**ПОЛОЦК В СИСТЕМЕ СТАНОВЛЕНИЯ И РАЗВИТИЯ СОЦИОТОПОГРАФИЧЕСКОЙ СТРУКТУРЫ ДРЕВНЕРУССКИХ ГОРОДОВ IX – XIII ВВ.**

Резюме

В статье рассматривается процесс становления и развития социотопографической структуры древнерусских городов Северной Руси (Ладога, Новгород, Изборск, Псков, Витебск, Полоцк). Анализ сделан на основе обобщения новейшей историографии. Приводятся новые археологические данные о социальном и топографическом развитии средневекового Полоцка в IX–XIII вв. Сделан вывод, что варяжский этнический элемент в Полоцке прослеживается в значительно меньшей степени по сравнению с Ладогой и Новгородом. Стратиграфия культурного слоя и материальная культура Полоцка во второй половине I тыс. имеют наибольшее сходство с раннегородскими поселениями Белорусского Подвинья – Витебском и Лукомлем.

*Dzianis Duk*

**POLOTSK IN THE SYSTEM OF FORMATION AND DEVELOPMENT OF SOCIOTOPOGRAPHIC STRUCTURE OF ANCIENT RUSSIA TOWNS IN 9 – 13 CENTURIES**

Summary

The article covers the process of formation and development of sociotopographic structure of Ancient Russia towns, the Northern region (Ladoga, Novgorod, Izborsk, Pscov, Vitebsk, Polotsk). The analysis is done on the basis of summarizing of modern historiography. Updated archaeological data of social and topographic development of Polotsk in 9–13 cc are given. The conclusion made is that the Viking ethnic element can be traced in a considerably lesser degree in Polotsk than in Ladoga or Novgorod. Culture layer stratigraphy and material culture of Polotsk in the second halt of the first millennium have a lot in common with the towns at the early stages of their development which are situated in Belarusian Podviniye (the Belarusian basin of the Dvina river) – Vitebsk and Lukoml.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова